


# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №5 (13)
Сакавік 2021


## У нумары:


**З Міжнародным Днём жанчын!** — **Стар. 1**

**Школа бяспекі - 2021** — **Стар. 2**

**Падведзены вынікі школьнага этапу раённага конкурсу малюнкаў “На варце тваёй бяспекі”** — **Стар. 2**

**Масленіца** — **Стар. 3**

**Урачыстае ўручэнне выдыння “Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь”** — **Стар. 4**

**ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна** — **Стар. 4**


# З Міжнародным Днём жанчын!




### Паважаныя жанчыны, калегі, матулі!

Сардэчна віншуем Вас з першым вясновым святам – з Міжнародным жаночым днём 8 Сакавіка!

З вамі, паважаныя жанчыны, звязана ўсё самае добрае і светлае. Вашы дабрыня і цярпенне, велікадушнасць, мудрасць і любоў заўсёды былі прадметам захаплення, натхнялі на вялікія справы.

Дзякуючы жанчыне, непарушнымі застаюцца такія каштоўнасці, як сям'я, дзеці, дом. Вы захоўваеце хатні ачаг і робіце гэты свет больш прыгажэйшым, вы валодаеце дзіўнай здольнасцю сумяшчаць хатнія клопаты з прафесійнай дзейнасцю.

Будзьце заўсёды прыгожымі, абаяльнымі і непаўторнымі. Няхай з вамі побач заўсёды будзе моцная, надзейнае мужчынскае плячо, а ў доме пануе мір і згода.

Сямейнага вам шчасця, усмешак, здароўя і дабрабыту! Са святам!

*Адміністрацыя і прафкам*
*Чэрнікаўшчынскага ВПК ДС-БШ*

# Школа бяспекі - 2021

4 сакавіка прайшоў раённы этап конкурсу "Школа бяспекі - 2021" сярод устаноў адукацыі Дзяржынскага раёна. Дадзены конкурс праводзіўся ў мэтах папулярызацыі прафесіі выратавальніка, вызначэння ўзроўню ведаў па пытаннях забеспячэння бяспекі жыццядзейнасці, а таксама падтрымкі найбольш здольных і адораных навучэнцаў.

У конкурсе нашу школу прадстаўлялі наступныя навучэнцы: Гурло Вячаслаў (4 клас), Ільючык Ілья (7 клас), Маглена Максім (9 клас).

Па ўмовах конкурсу вучні рашалі тэсты, якія складаліся са 100 пытанняў.

Навучэнцы нашай школы паспяхова прайшлі дадзены іспыт!





# Падведзены вынікі школьнага этапу раённага конкурсу малюнкаў “На варце тваёй бяспекі”

Адбыўся школьны этап раённага конкурсу малюнкаў "На варце тваёй бяспекі!”, прымеркаванага да Дня міліцыі. У конкурсе прымалі ўдзел школьнікі ад 7 да 15 гадоў. Дзеці вельмі стараліся прявіць сваю фантазію і кемлівасць. Малюнкі атрымаліся змястоўнымі і яркімі.

5 сакавіка на школьнай лінейцы прайшло ўзнагароджанне ўдзельнікаў конкурсу. Лепшыя работы накіраваны для ўдзелу раённым этапе конкурсу малюнкаў.












# Масленіца



Масленіца - свята язычніцкае. Пасля прыняцця хрысціянства царква асвяціла свята і напоўніла яго новымі ідэямі. Масленічны тыдзень стаў апошнім этапам падрыхтоўкі да Вялікага посту. У хрысціянскай традыцыі за час Масленіцы вернікі павінны наблізіцца да дараванню ўсіх крыўд, прымірэння з блізкімі.

Як весела святкавалі Масленіцу ў нашай школе - глядзіце ў фотасправаздачы.









# Аб’ява!!!




**Да ўвагі навучэнцаў і іх бацькоў!**

На вясенніх канікулах з 29 сакавіка па 3 красавіка ўключна ў школе будзе працаваць школьны аздараўленчы лагер “Вясёлка” з дзённым наведваннем. Дзяцей чакае насычаны і актыўны адпачынак, шматлікія цікавыя справы, спартыўныя мерапрыемствы і вясёлы час з сябрамі!

За падрабязнай інфармацыяй звяртайцеся да класных кіраўнікоў.

# Урачыстае ўручэнне выдання “Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь”



19 сакавіка на ўрачыстай лінейцы вучань 8 класа Чарняўскі Мікіта атрымаў з рук дырэктара школы Аляксандра Сяргеевіча Крыварота выданне "Я - грамадзянін Рэспублікі Беларусь".

Для маладога чалавека чатырнаццацігадовы ўзрост - час станаўлення ўласнага "Я", выбару актыўнай жыццёвай пазіцыі. Важна выразна ўяўляць, у якой краіне ты жывеш, якімі правіламі валодаеш, якія законы павінен шанаваць.

Кніга «Я - грамадзянін Рэспублікі Беларусь» выдатна аформлены альбом аб нашай Радзіме, яе гісторыі, дзяржаўным ладзе, непаўторнай прыродзе, нацыянальных традыцыях.







# ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна

25 сакавіка для вучняў 8-9 класаў прайшоў адзіны дзень інфармавання ў рамках рэспубліканскага праекта "Школа Актыўнага Грамадзяніна" на тэму: "Беларусь і Расія: гісторыя станаўлення і развіцця Саюзнай дзяржавы" (да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі).

Класны кіраўнік 9 класа Баркоўская Галіна Іванаўна пазнаёміла вучняў з наступнымі інфармацыйнымі блокамі: "Яднанне народаў Беларусі і Расіі: падзеі, факты"; "Будучыня Саюзнай дзяржавы - у руках моладзі і для моладзі".

На дадзеным мерапрыемстве прысутнічаў ганаровы госць - Лобач Уладзімір Іосіфавіч, старшыня Фаніпальскага сельскага выканаўчага камітэта. Уладзімір Іосіфавіч расказаў навучэнцам пра VI Усебеларускі народны сход, непасрэдным удзельнікам якога ён і з'яўляўся, азнаёміў з асноўнымі рашэннямі вышэйназванага форуму.







Рэдкалегія: вучні 9 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 9 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 30 красавіка.